АЎТАРСКАЯ КАЛОНКА

# Нельга забываць...

**Днямі, аддаўшыся пачуццю настальгii, перагортвала сямейныя фотаальбомы. Мяне так захапілі эмоцыі і ўспаміны, што нават не заўважыла, як падышоў сын. І ўстрапянулася толькі, калі ён ціхенька спытаў: «А хто гэта?» і паказаў на здымак на адной са старонак.**

– Мой дзядуля, а твой прадзядуля Фёдар Піліпавіч. Вось такі малады і статны ён быў якраз тады, калі яго прызвалі ў армію. А калі ўжо рыхтаваўся да дэмабілізацыі, Радзіма паклікала ўстаць на абарону ад карычневай чумы. Наш мужны родзіч, як сапраўдны патрыёт, адданы сваёй зямлі, ні хвіліны не вагаўся, адразу ж папоўніў рады барацьбітоў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ён прайшоў нялёгкі ваенны шлях, быў паранены. Але не збочыў з абранай дарогі, застаўся цвёрдым у сваіх перакананнях. Будзь і ты, сынок, годным нашчадкам свайго слаўнага продка, – заўважыла я.

А ён паглыбіўся ў роздум. Яго твар стаў надта сур'ёзным і засяроджаным. І я не сумняюся, што сын разважаў пра мінулае роднага краю, пра тых, хто, не шкадуючы ні сіл, ні жыцця, аказваў супраціўленнне ворагам, каб яны не змаглі паставіць наш народ на калені.

Дзяды і прадзеды плячом да пляча адстойвалі незалежнасць Айчыны, баранілі яе ад фашысцкай навалы, у партызанскіх атрадах, падполлі, на фронце набліжалі вялікае свята Перамогі. І пра гэта нельга забываць. Бо менавіта памяць пра ваенны подзвіг нашых продкаў з'яўляецца найважнейшай рысай нацыянальнай ідэнтычнасці і крыніцай, з якой мы чэрпаем духоўныя сілы і волю для адстойвання нацыянальных інтарэсаў у такіх няпростых сучасных геапалітычных умовах.

**На мой погляд, няма апраўдання тым, хто спрабуе адрадзіць ідэалогію і сімвалы нацызму, апраўдаць генацыд, перапісаць гісторыю ў палітычных мэтах. А каб такога не здаралася, мы, дарослыя, пра вайну павінны гаварыць з дзецьмі з самага маленства.**

Расказваць пра подзвігі землякоў і родзічаў, пра жахі Вялікай Айчыннай і якую велізарную цану заплаціла наша краіна за перамогу: мільёны чалавечых жыццяў, скалечаныя лёсы тысяч людзей, разбураныя гарады і сёлы...

Памяць пра мінулае – гэта адначасова і клопат пра сучаснасць і будучыню. Таму нават на імгненне нельга забываць крывавую старонку гісторыі, каб не дапусціць яе паўтарэння, каб шчаслівая і мірна жылі людзі, умацоўвалася і прыгажэла наша Беларусь.

**Наталля ВІЛЕНТА.**

НАША ПАМЯЦЬ

# Не раз быў на валасок ад смерці

**Наш зямляк Антон Бараноўскі з вёскі Мардвілавічы з кагорты тых, хто зведаў усе жахі і нягоды ваеннага ліхалецця, не па чутках ведаў, якой цаной здабыта Вялікая Перамога.**

Яго, як і многіх іншых ураджэнцаў Любаншчыны, пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкай акупацыі мабілізавалі ў Чырвоную Армію ў ліпені 1944-га. Часу на развагі не было. Антон прайшоў паскораны курс абучэння ў запасным палку і далучыўся да барацьбы з ворагам.

На пачатку восені яго 328-я дывізія, прымаючы ўдзел у Люблін-Брэсцкай аперацыі, фарсіравала Заходні Буг на поўдзень ад Брэста. Далей працягнула свой шлях ужо па тэрыторыі Польшчы. Да 10 верасня выйшла да Віслы, а 14-га ў выніку жорсткіх баёў з гітлераўцамі разам з іншымі савецкімі часцямі авалодала прадмесцем Варшавы – Прагай. І на тым не спынілася – прадоўжыла рух, рыхтуючыся да пераправы праз Віслу.

Сапёры, сярод якіх і наш зямляк, якраз і майстравалі лодкі для той пераправы. Але гэта, вядома ж, быў не асноўны занятак. Яны мініравалі і зацягвалі калючым дротам, прыкрываючы ад контратак праціўніка, пярэдні край пазіцый дывізіі, вялі інжынерную разведку, выяўляючы мінныя палі гітлераўцаў, каб потым у начным змроку здымаць там супрацьтанкавыя і супрацьпяхотныя міны, будавалі бліндажы для назіральных і камандных пунктаў.

Усе гэтыя і многія іншыя справы даволі падрабязна апісаны ў журнале баявых дзеянняў 606-га асобнага сапёрнага батальёна. Так, напрыклад, там занатавана, што 29 кастрычніка 1944-га два ўзводы сапёраў «знаходзіліся ў палках з задачай суправаджэння стралковых падраздзяленняў». Тады дывізія грамiла фашыстаў на правабярэжжы Віслы ў раёне населеных пунктаў Хатомаў, Яблона, Легіёнава. Зрэшты, гітлераўцы акапаліся не толькі ў названых вёсках ды гарадках, але і на навакольных вышынях, ператвараўшы іх ў моцныя вузлы абароны.

Каб захапіць іх, спачатку трэба было непрыкметна размініраваць варожыя мінныя палі, а таксама зрабіць праходы ў драцяных агароджах перад акопамі праціўніка. Гэта ў ноч на 29 кастрычніка і рабілі тыя ўзводы сапёраў. Прычым пад ледзь не бесперапынным кулямётным агнём з шасці- і дзесяціствольных нямецкіх мінамётаў.

Нашаму земляку, пэўна, здавалася, што кожная куля, выпушчаная фашыстамі, асколак ад узорванай міны можа патрапіць менавіта ў яго. Але ён ужо навучыўся пераадольваць страх і ўважліва, без мітусні выконваць сваю баявую задачу.

Варта сказаць, тады стралкам 1105-га палка дзякуючы зладжаным дзеянням сапёраў удалося значна пацясніць гітлераўцаў і замацавацца на новым рубяжы. А ў ноч на 31 кастрычніка ўсё паўтарылася зноў. У журнале запісана: «Узводамі старшага сяржанта Старадубцава, старшага лейтэнанта Грыцюка, лейтэнанта Грабенюка ў 1105-м палку зроблены тры праходы ў дротавай агароджы і мінным полі праціўніка шырынёю кожны ад шасці да дзевяці метраў». І зноў пад шалёным абстрэлам фашыстаў.

**Што сабою ўяўляла тая дротавая агароджа, можна даведацца ўжо з узнагароднага ліста, якім Антона Паўлавіча прадставілі да ордэна Славы 3-й ступені. Дык вось, яна складалася з пяці радоў калоў з нацягнутай між імі спіраллю Бруно, якая магла стаць неадольнай перашкодай на шляху стралкоў. Але не стала! Таму так высока работу Антона Бараноўскага ацаніла камандаванне.**

Зрэшты, сярод цяжкіх баявых будняў здараліся мінуты, якія выклікалі станоўчыя эмоцыі ў сапёраў. Пра тое, у прыватнасці, сведчыць запіс у журнале баявых дзеянняў ад 2 лістапада 1944-га: «Раніцай адклікалі два ўзводы з палкоў. Адно аддзяленне малодшага сяржанта Сталярэнкі на чале са старшым лейтэнантам Рубінчыкам накіравана для перавозкі металалому. Па загадзе камандзіра часці на машыне ЗІС-5 металалому перавезлі пяць тон. Удзень быў прагледжаны канцэрт мастацкай самадзейнасці дывізіі».

Праўда, такія моманты здараліся на фронце не надта часта. Асноўны час займала баявая работа – рызыкоўная і небяспечная. Вось і ў адзін са снежаньскіх дзён, калі тры сапёры ўдзельнічалі ў разведцы ў раёне могілак Хатомава, яны трапілі пад варожы агонь. У выніку адзін з іх атрымаў раненне і эвакуіраваны ў медсанбат. А наш зямляк кантужаны, але застаўся ў часці.

Акрыяўшы, Бараноўскі ізноў устаў у строй. У студзені 1945-га ў ходзе Варшаўска-Познанскай аперацыі 328-я стралковая дывізія фарсіравала Віслу, разам з іншымі падраздзяленнямі Чырвонай Арміі ўзяла Варшаву і пагнала ворага далей з польскай зямлі. І зноў Антон Паўлавіч праявіў сябе па-геройску. «Тав. Бараноўскі, – адзначалася ва ўзнагародным лісце да медаля «За адвагу», – удзельнічаў пад моцным агнём праціўніка ў складзе інжынернай разведкі з задачай знайсці зручнае месца для пераправы праз раку Кюдоў. У выніку смеласці і мужнасці з боку тав. Бараноўскага такое месца было знойдзена. Сам ён асабіста правёў першы батальён 1103-га стралковага палка і без страт пераправіў на другі бераг, забяспечыўшы тым самым поспех наступлення ўсяго падраздзялення».

Потым 328-я ўдзельнічала ва Усходне-Памеранскай аперацыі, з 16 красавіка 1945-га – у Берлінскай... Антон Паўлавіч не раз знаходзіўся на валасок ад смерці, але, на шчасце, вытрымаў выпрабаванні, не скарыўся перад варожым напорам і з перамогай вярнуўся дадому...

**Барыс КВІТКЕВІЧ.**

